# Паэт, педыятр, «Платон»

## У Мінску выбралі «Студэнта года — 2018»

**Тытул застаўся ў Гродзеншчыны: яе ўраджэнка, мінулагодняя пераможца Аляксандра Радковіч, узрадавалася і з гонарам абвясціла, што сёлета яго ўладальнікам стаў пяцікурснік Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Антон ЛЕМЕШ *(на фота)*. Журы прызнала юнака найлепшым у фінале VIII рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Студэнт года — 2018».**

Акрамя Антона яшчэ два хлопцы і шэсць дзяўчат песнямі, танцамі, вершамі дэманстравалі сваё ўсебаковае развіццё. А сам ён стараўся быць на сцэне максімальна шчырым. «Сёння я даказаў, што, нават калі не ўмееш спяваць і танцаваць, перамога ўсё адно можа быць за табой», — сказаў хлопец.

Стаць найлепшым у конкурсе — няпроста. Аднак, як з іроніяй заўважае Антон, «складаней, чым вучоба ў медыцынскім, нічога не бывае». За пяць гадоў будучы ўрач паспеў і дзяцей палячыць, і ў хуткай дапамозе папрацаваць, і нават роды прыняць.

СТАР. 13

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду»
на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# Паэт, педыятр, «Платон»



Ігар ГЕЛДЗІНСКІ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Антон вылучыўся сярод іншых яшчэ ў конкурсе прэзентацый «Будзем знаёмыя». Арыгінальны і крэатыўны, ён вырашыў ускладніць сабе задачу: казаць словы толькі на літару «П». Пачалася яго біяграфія з «першай палаты» раддома, дзе акушэрка прамовіла: «Папаша, принимайте, парень, поздравляю». А скончылася цяперашнім часам — студэнцтвам: «Проучившись пять, прекрасно понимаю: прошёл правильный путь. Педиатр!»

Дзеля конкурсу Антон навучыўся... пісаць вершы. На этапе прамоўніцкага майстэрства «#Упрафесіі» хлопец уявіў сябе ваенным урачом, які расказвае салдатам, у чым сутнасць яго прызвання. Адзін з радкоў прагучаў як жыццёвае крэда: «Я звычайны ўрач і дапамагаю людзям не таму, што павінен. А таму, што я магу».

На інтэлектуальным этапе студэнт таксама не разгубіўся. На пытанне ад спецыяльных гасцей «Калі б у цябе была магчымасць палепшыць свет, пазбавіўшы толькі ад адной рэчы, што гэта было б?» сур'ёзнасць спалучыў з гумарам: «Калі не лічыць рускі рэп... Фанабэрыю. Лічу, што гэтая загана псуе адносіны паміж людзьмі».

Дарэчы, без жартаў Антон не можа: ледзь не кожная фраза — вясёлая і жывая — прымушала залу смяяцца. Ён мяркуе, што гульня ў КВЗ за ўніверсітэт дапамагае выкарыстоўваць пачуццё гумару не толькі ў жыцці, але і ў творчых нумарах. «Яшчэ старажытныя мудрацы лічылі, што без смешнага нельга спасцігнуць сур'ёзнае. Антон. Э, прабачце, Платон», — жартаваў хлопец.

...На прамоўніцкім і інтэлектуальным заданнях адметнай была і Алеся Гатальская, таксама медык, але з універсітэта-канкурэнта — гомельскага. На «выдатна» расказаўшы пра значнасць сваёй прафесіі і трапна адказаўшы на пытанне, тым самым прыцягнула ўвагу дзяжурнага ўрача хуткай дапамогі, які прысутнічаў на мерапрыемстве. Той падзякаваў за важныя словы і з гонарам адзначыў, што змена расце годная.

Журы конкурсу не шкадавала нікога. Як заўважыў адзін з яго членаў, вядомы тэлевядучы Яўген Перлін, «жыццё не робіць скідак, і я не буду». Дарэчы, ён і ставіў канкурсантам самыя нізкія адзнакі. Але нумар Антона на апошнім, творчым заданні «Мая малая радзіма» скарыў і Перліна. Інакш адкуль сярэдні бал 10,0?

— Не танцую, як Цыскарыдзэ, і Саладухам мне не стаць, — пачаў выступленне хлопец. — Але малую радзіму я так прадстаўлю, што кожны захоча там пабываць! Словы — смаргонскія, музыка — італьянская.

Пад вядомую, але перароблeную на свой лад песню Felicita Антон у звыклай ужо жартаўлівай манеры даказваў, што Смаргонь азначае шчасце («фелічыта»).



Марыя САЎЧАНКА.

Дарэчы, апошні конкурс і стаў вырашальным у вызначэнні пераможцы, бо на працягу ўсяго вечара канкурсанты ішлі па балах даволі шчыльна. Усе нумары — неверагодна яркія, гарачыя, як само вірлівае студэнцкае жыццё.

Другое месца заняў перспектыўны танцор з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ігар Гелдзінскі, які запомніўся многім гледачам як энергічны і харызматычны малады чалавек. Замкнула тройку Марыя Саўчанка, актыўная, але ў той жа час засяроджаная, спакойная і разважлівая трэцякурсніца Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна ўразіла сваім мультымедыйным прадстаўленнем, а таксама выкананнем пераробленай на беларускую мову папулярнай песні Цімы Беларускіх «Мокрыя кросы». Здаецца, за Машу гучней за ўсіх хварэла група падтрымкі: у балельшчыцкім арсенале быў міні-рупар, а таксама бясконцы набор крычалак.

Студэнты правялі цэлыя чатыры дні разам: наведвалі майстар-класы, мерапрыемствы, экскурсіі. Нягледзячы на неверагодную стомленасць, у іх памяці засталіся незабыўныя ўражанні, шчырыя эмоцыі, радасць новых знаёмстваў...

Конкурс «Студэнт года» праводзіцца БРСМ ужо восем гадоў. Аднак 2018-ы — адметны. Як расказаў **першы сакратар ЦК Саюза моладзі Дзмітрый ВАРАНЮК**, сёлетнія фіналісты будуць прадстаўляць Беларусь на міжнародным форуме «Студэнцкая вясна — 2019» краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»**

**Лот № 1.** Здание общежития, инв. № 500/С-15837. Г. п. – 1960. Площадь – 710 кв. м. Этажность – 2, подвал. Адрес: г. Минск, ул. Гикало, д. 22А.

**Начальная цена – 2 000 000,00 бел. руб. без НДС.**

**Задаток – 100 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**Земельный участок:** земельный участок площадью 0,3944 га с кадастровым номером 500000000008001937. Целевое назначение земельного участка: Эксплуатация и обслуживание здания общежития № 3. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям-владельцам инженерных коммуникаций, площадь 0,3944 га. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 26.12.2018 в 10.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга», 220013, г. Минск, ул. Петруся Бровки, д. 8, комн. 201, тел. 8 (017) 280-87-01.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот№1), принадлежащего ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга», проводимом 26.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 21.12.2018 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Васильев Андрей Алексеевич, тел. 8 (029) 657-16-66

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**